**А. М. Літвін**

# АДЗНАЧЭННЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ САВЕЦКІХ СВЯТАЎ НАСЕЛЬНІЦТВАМ І ПАРТЫЗАНАМІ ПАДЧАС НАЦЫСЦКАЙ АКУПАЦЫІ БЕЛАРУСІ

У 2020 годзе адзначаецца 75-я гадавіна заканчэння Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай вайны. Чым далей адыходзяць у мінулае жудасныя падзеі мінулага людабойства, тым больш рэльефна і выпукла прасочваюцца ратныя, працоўныя подзвігі народаў былога СССР, якія ўспрынялі і вынеслі на сябе асноўны цяжар мінулай вайны. Таму зусім не выпадкова асаблівую ўвагу і цікавасць сусветнай грамадскасці выклікаюць пытанні ролі і месца ў Перамозе над гітлераўскай Германіяй і яе хаўруснікамі Савецкага Саюза, Чырвонай Арміі, уклада ў Перамогу народаў, вышэйшага кіраўніцтва дзяржавы, краін і народаў былога СССР. За пасляваенны перыяд айчынная гістарыяграфія

накапіла значны пласт прац па гісторыі зараджэння партызанскага руху і падпольнай барацьбы, аб баявой і масава-палітычнай дзейнасці партызанскіх фарміраванняў, падпольных партыйных і камсамольскіх органаў на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Звесткі аб гэтым маюцца ў шматлікіх дакументах і матэрыялах, надрукаваных ў акадэмічных навуковых [1; 2; 3; 4] і дакументальных выданнях [5; 6; 7] у мемуарнай літаратуры[1].

75-гадовы юбілей – гэта вельмі значны гістарычны перыяд, які дае магчымасць больш глыбока і ўсебакова разглядаць падзеі мінулай вайны, у тым ліку і пытанні, на якія па шэрагу прычын даследчыкі раней не звярталі ўвагу. Да адных з такіх пытанняў адносяцца і пытанні аб тым, як насельніцтва акупаванай нацыстамі тэрыторыі БССР адносілася да савецкіх святаў, якія на дзяржаўным узроўні актыўна насаждаліся на тэрыторыі БССР у 1920–1930 гг., а на тэрыторыі заходніх абласцей – толькі пасля далучэння іх у склад адзінай дзяржавы.

Дакументы і матэрыялы, мемуарныя крыніцы сведчаць аб тым, што падрыхтоўка і святкаванне савецкіх дзяржаўных і рэвалюцыйных дат і святаў былі адным з разнастайных элементаў штодзеннасці ваеннага часу, а для падпольных органаў і камандавання партызанскіх фарміраванняў, якія сябе прадстаўлялі прадстаўнікамі савецкай улады, дзейсным механізмам уздзеяння на свядомасць насельніцтва, выхавання ў іх пачуцця таго, што савецкая ўлада хутка вернецца. Таму святкаванню савецкіх рэвалюцыйных святаў, у першую чаргу гадавін Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, асноўнага савецкага свята, падпольнымі партыйнымі органамі, камандаваннем партызанскіх фарміраванняў Беларусі надавалася вельмі важнае значэнне. Напярэдадні святаў у населенных пунктах партызанскіх зон праводзіліся мітынгі, сходы, на якіх выступалі спецыяльна падрыхтаваныя выступоўцы-палітінфарматары, а таксама камандзіры і камісары партызанскіх фарміраванняў, партыйныя і камсамольскія кіраўнікі і палітработнікі. У партызанскіх фарміраваннях, як і ў савецкі час на прадпрыемствах і ўстановах, наладжвалася сацыялістычнае спаборніцтва, толькі на гэты час паказчыкам была колькасць знішчаных ворагаў.

Дакументы таго часу таксама сведчаць аб тым, што акрамя асноўнага свята – Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі – у арганізацыйнай і масава-прапагандысцкай дзейнасці партызан і падполля шырока выкарыстоўваліся і адзначаліся насельніцтвам Беларусі і іншыя савецкія святы і рэвалюцыйныя даты: дні РСЧА, 1-е мая, гадавіны БССР, камсамола.

Цікавым і навукова недаследаваным да сённяшняга часу з'яўляецца пытанне аб прысваенні назваў партызанскім фарміраванням. Вядома, што першапачаткова партызанскія атрады назваў не мелі. Звычайна яны называліся па імені камандзіра. Напрыклад, атрад Каржа, Шмырова, Заслонава, альбо па падпольнаму псеўданіму атрад «Дубняка» (П. М. Машэрава), «Дзядзі Васі», «Аляксея», «Дзядзі Колі», «Баці», «Градава» і г.д.

[1] Па падліках Г. Д. Кнацько, да 1999 г. ў выдавецтвах Беларусі выдадзена 213 мемуараў, у тым ліку 179 мемуараў асобных аўтараў і 34 зборнікі ўспамінаў.

Потым атрадам і брыгадам сталі прысвойваць імёны славутых герояў грамадзянскай вайны (Чапаева, Лазо, Шчорса, Пархоменка), правадыроў партыі і ўраду (Леніна, Сталіна, Свярдлова, Калініна, Кірава, Кагановіча), герояў і вядомых военачальнікаў перыяду грамадзянскай вайны (Фрунзе, Варашылава, Будзённага, Дзяржынскага), славутых Герояў Савецкага Саюза (Чкалава, Гастэла, Грызадубавай, Жукава, Ракасоўскага). Імя Чапаева і імя П. Панамарэнкі насілі адпаведна па пяць беларускіх партызанскіх брыгад.

Акрамя гэтага, шэраг партызанскіх атрадаў былі названы ў гонар 25-й і 26-й гадавіны кастрычніка. Так, у кастрычніку 1942 г. на базе дыверсійных груп І. І. Апаровіча і С. П. Піткевіча, якія прыбылі з Вялікай зямлі па заданні ЦК КП(б)Б, з жыхароў вёсак Літвяны, Станькава, Кукшэвічы Дзяржынскага раёна быў створаны партызанскі атрад «25 год Кастрычніка». Відавочна, што назва атраду дыктавалася надыходзячым юбілеем. Камандзірам атрада стаў Іосіф Іосіфавіч Апаровіч (X.1942 – VII.1944), камісарам Петр Рыгоравіч Мартысюк (X.1942 – VIII.1943), а затым Уладзімір Трафімавіч Гаваркоўскі (IX.1943 – VII.1944). Да студзеня 1943 г. атрад дзейнічаў самастойна, а потым у складзе 300-й партызанскай брыгады імя К. Я. Варашылава.

Загадам ад 21 жніўня 1943 г. на базе атрадаў «25 год Кастрычніка» і імя Д. А. Фурманава, выдзеленых з 300-й брыгады, была створана 200-я партызанская брыгада імя К. К. Ракасоўскага. Пазней былі ўтвораны атрады імя Чкалава і імя Дзяржынскага. Брыгада дзейнічала ў Капыльскім, Дзяржынскім і Уздзенскім раёнах. Злучылася з Чырвонай арміяй 4 ліпеня 1944 г. у складзе чатырох атрадаў колькасцю 1 187 партызан. Атрад «25 год Кастрычніка» налічваў 371 партызана [8, с. 417, 444, 445].

У пачатку снежня 1943 г. на базе ініцыятыўных груп, выдзеленых партызанскімі атрадамі імя А. В. Суворава, імя В. І. Чапаева і імя С. М. Буденнага з 225-й партызанскай брыгады імя А. В. Суворава партызанскага злучэння Мінскай вобласці, быў створаны партызанскі атрад імя 26-годдзя Кастрычніка. На момант злучэння з Чырвонай арміяй атрад налічваў 204 партызан [8, с. 416, 417].

У снежні 1943 г. загадам Упаўнаважанага ЦК КП(б)Б і БШПР па Баранавіцкай вобласці на базе атрадаў «Грозны», імя Катоўскага, імя С. М. Будзенага, выдзеленых Першамайскай брыгадай была створана партызанская брыгада «25 год БССР», камандзір – Мічурын Барыс Александравіч, камісар – Смірноў Петр Іванавіч. Адначасова быў сфарміраваны атрад «25 год БССР», камандзір – Васілій Мікалаевіч Малкаў, камісар – Павел Пятровіч Андрэеў. На дзень злучэння з Чырвонай арміяй брыгада налічвала 811 партызан, у тым ліку 135 партызан у атрадзе.

У студзені 1944 г. знакамітай 123-й Акцябрскай партызанскай брыгадзе Палескай вобласці было прысвоена імя 25-годдзя БССР (камандзіры – Ф. І. Паўлоўскі, С. В. Маханько). Злучылася з Чырвонай арміяй 26 чэрвеня і 5 ліпеня 5 атрадаў, 609 партызан.

У канцы снежня 1943 г. з асабовага складу 1-й стралковай роты партызанскага атрада імя С. М. Будзеннага партызанскай брыгады імя П. К. Па-

намарэнкі Баранавіцкай вобласці быў створаны партызанскі атрад імя 26-годдзя БССР. Камандзірам быў прызначаны Аляксей Антонавіч Лугар, камісарам – Павел Акімавіч Траеглазаў (снежань 1943 – май 1944 г., загінуў).

Два партызанскіх атрады былі названы ў гонар 25-годдзя ВЛКСМ. У студзені 1942 г. на базе ініцыятыўнай групы Трафіма Цярэнцьвіча Жулегі, якая была выдзелена партызанскім атрадам Уладзіміра Цімафеевіча Шантара, быў створаны партызанскі атрад, які да кастрычніка 1943 г. насіў імя свайго камандзіра Т. Ц. Жулегі, а затым быў перайменаваны ў атрад імя 25-годдзя ВЛКСМ. На дзень злучэння з Чырвонай арміяй налічваў 247 чалавек.

25 кастрычніка 1943 г. з партызан, выдзеленных атрадамі імя Варашылава (60 чал), імя Шчорса (10 чал), 3-й Мінскай партызанскай брыгады імя Будзенага і моладзі Рудзенскага і Пухавіцкага раёнаў, быў створаны партызанскі атрад імя 25-годдзя ВЛКСМ. Камандзір – Мікалай Сідаравіч Сянквіч, камісар – Іван Васільевіч Карасеў.

У лютым 1944 г. у партызанскай брыгадзе імя Чапаева (створана 29 чэрвеня 1943 г.) Беластоцкай вобласці быў сфарміраваны партызанскі атрад імя 26-годдзя РККА (РСЧА). На дзень злучэння налічваў 79 партызан.

Безумоўна, факты арганізацыі і святкавання рэвалюцыйных дат, прысваення партызанскім фарміраванням імя герояў рэвалюцыі, партыйных і дзяржаўных дзеячаў, вядомых герояў Вялікай Айчыннай вайны, юбілейных датаў, мелі для правядзення масава-палітычнай працы сярод партызан і насельніцтва вялікае значэнне як у выхаванні патрыятычных пачуццяў, так і ўмацаванні веры ў хуткую перамогу над ворагам.

У дадзенай працы зроблена спроба звярнуць увагу на асобныя пытанні ваеннай паўсядзеннасці жыцця насельніцтва і партызан. Узаемаадносіны паміж імі ўключалі мноства разнастайных элементаў камунікацыі, важнае месца сярод іх займалі асабістыя сустрэчы на сходах і мітынгах, якія пастаянна адбываліся як пры падрыхтоўцы і правядзенні савецкіх святаў, так і пры іншых абставінах. Удзел насельніцтва ў святкаванні ці адзначэнні савецкіх святаў з’яўляўся як сведчаннем палітычнай і ідэлагічнай дэманстрацыі лаяльнасці насельніцтва да савецкай улады, так і сведчаннем непрымання ім мерапрыемстваў акупантаў.

Асаблівае значэнне для падтрымкі патрыятычных настрояў, упэўненасці ў непазбежнай перамозе над ворагам, павышэння вайсковай дысцыпліны і баявой падрыхтоўкі мела правядзенне масавых мітынгаў, а таксама партызанскіх парадаў у партызанскіх фарміраваннях і партызанскіх зонах.

На заключным этапе партызанскай барацьбы, падчас канчатковага вызвалення тэрыторыі Беларусі летам 1944 года, кіраўніцтва БССР арганізацыяй масавых мітынгаў і партызанскіх парадаў у г. Мінску і абласных цэнтрах імкнулася асобным чынам паказаць і падкрэсліць ролю партызанскіх фарміраванняў, падкрэсліць іх непарушную сувязь з Чырвонай арміяй. Дэманстрацыя партызанскай арміі была накіравана не толькі для кіраўніцтва ў Маскве, але і для карэспандэнтаў замежных сродкаў інфармацыі.

Як вядома, адной з галоўных функцый савецкай прапаганды і масава-палітычнай працы пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі было фарміраванне вобразу, іміджа новай «савецкай» улады, а таксама новай дзяржавы рабочых і сялян і тых сацыялістычных пераўтварэнняў і заваяванняў, якія адбываліся ў СССР. Усё гэта рабілася на фоне злога вобраза былой дзяржавы ў свядомасці насельніцтва. Сутнасць гэтага дзеяння была сфармулявана ў словах партыйнага гімна: «Весь мир насилья мы разрушим до основанья, а затем мы свой, новый мир построим, кто был ничем, тот станет всем» (увесь мір насілля мы разбурым «до основанья», а затым мы свой, мы новы мір пабудуем, хто быў нікім, той стане ўсім). Былая дзяржава паказвалася як «турма народаў», на чале якой стаялі галоўныя ворагі народа – цар і яго сям'я, капіталісты і памешчыкі. Таму з першых дзён бальшавіцкай улады знішчаліся помнікі былой і ствараліся помнікі новай улады, ствараўся пантэон тых, з каго моладзі трэба ў першую чаргу браць прыклад. Важнае месца ў фарміраванні вобразу новай улады надавалася рэвалюцыйным дням і датам, постацям класікаў марксізму-ленінізму і выбітным рэвалюцыянерам. У сувязі з гэтым савецкім партыйна-дзяржаўным апаратам асаблівая ўвага надавалася адзначэнню (святкаванню) рэвалюцыйных, дзяржаўных і памятных дат.

Нагадаем, што да канца 1920-х гадоў, разам со згортваннем нэпу, з афіцыйных савецкіх календароў пастунова зніклі рэлігійныя святы. З 1929 г. у БССР святочнымі* засталіся: 1 студзеня – Дзень абвяшчэння БССР, 22 студзеня – Дзень 9 студзеня 1905 (у памяць пра крывавую нядзелю 1905 г. і памяць У. І. Леніна), 12 сакавіка – Дзень звяржэння царызму, 18 сакавіка – Дзень Парыжскай камуны, 1 і 2 мая – Дзень Інтэрнацыяналу, 11 ліпеня – Дзень вызвалення Савецкай Беларусі ад белапалякаў, 7 і 8 лістапада – Дзень Пралетарскай рэвалюцыі. Напачатку 30-х гадоў статус святочых страцілі дні 22 студзеня, 12 і 18 сакавіка. Пасля прыняцця 5 снежня 1936 г. новай Канстытуцыі СССР дзень 5 снежня таксама стаў святочным. Акрамя галоўных святаў у святочным каляндары быў шэраг святаў (памятных дзён), якія з'яўляліся працоўнымі, аднак таксама адзначаліся: 23 лютага – Дзень РСЧА, 8-га сакавіка – Міжнародны камуністычны жаночы дзень, розныя прафесійныя святы і інш. [9, с. 3].

У выдадзенай у 2009 г. ў Расіі грунтоўнай працы нямецкага гісторыка Мальтэ Рольфа, падрыхтаванай на вялізным архіўным і гістарыяграфічным матэрыяле, падрабязна разглядаюцца шлях стварэння ў Савецкім Саюзе асобага «чырвонага календара» і фарміраванне спецыфічнай савецкай культуры падрыхтоўкі і правядзення масавых святаў, з дапамогай якіх «інсцэніруючая дыктатура» дэманстравала свае дасягненні, прывівала грамадству ўласныя ідэалагічныя стандарты. На думку даследчыка, савецкае свята з'ўлялася палітыкай, узорам адносін паміж уладай і грамадствам, вызначала сферы іх кампетэнцый і з'яўлялася рэдкім месцам персанальнай сустрэчы правадыроў і мас. Удзел

*Дні, на якія яны выпадалі, лічыліся выхаднымі.

у свяце прадугледжваў педагагічнае ўздзеянне, выпрацоўваў у грамадстве новыя мадэлі паводзінаў, фарміраванне новага савецкага чалавека, які атрымліваў уяўленне аб уласным месцы ў сацыяльнай іерархіі [10, с. 9, 325, 326].

З канца 20-х гадоў галоўным савецкім святам становіцца Дзень Вялікай кастрычніцкай рэвалюцыі – 7 лістапада. На думку савецкага кіраўніцтва, падрыхтоўка і правядзенне святкаванняў мусілі мець масавы характар і дэманстраваць усеагульную падтрымку насельніцтвам курса партыі і ўрада. Цягам 1920–1930-х гадоў у Савецкім Саюзе быў накоплены значны вопыт і выпрацаваны спецыяльны рытуал святкавання, які ўключаў шэраг мерапрыемстваў: шырокую прапагандысцкую кампанію ў сродках масавай інфармацыі, у працоўных і вайсковых калектывах, установах адукацыі аб гістарычнай значнасці святаў, правядзенне палітінфармацый, урачыстых сходаў і мітынгаў у працоўных і навучальных калектывах, арганізацыю сярод насельніцтва массавага сацыялістычнага спаборніцтва і падвядзенне яго вынікаў, узнагароджанне «лепшых з лепшых»; правядзенне масавых маніфестацый насельніцтва ў абласных і раённых цэнтрах, іншых населеных пунктах. Важнае месца надавалася культурнавыхаваўчым мерапрыемствам: паказу кінафільмаў, тэтральных пастановак, выступленняў калектываў мастацкай самадзейнасці і г.д.

Другім па значнасці савецкім святам з'яўляўся дзень 1 мая – Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных, які святкавалі два дні. У першы дзень праводзіліся маніфестацыі і парады, у другі – маёўкі.

Вядома, што падчас акупацыі тэрыторыі Беларусі нямецкія ўлады адмянілі савецкую палітычную сістэму, а таксама ўсе савецкія святы, за выключэннем дня 1 мая, якое таксама адзначалася акупантамі.

У дадзеным артыкуле акцэнтуецца ўвага толькі на адным пытанні вялікай тэмы савецкіх святаў, на тым, якім было падчас нямецка-фашысцкай акупацыі Беларусі стаўленне насельніцтва да галоўнага свята савецкай улады – Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, свята 7 лістапада.

Знаёмства з архіўнымі дакументамі і матэрыяламі, мемуарнымі сведчаннямі ўдзельнікаў падзей паказвае, што ў адзін з найбольш крытычных для савецкай краіны перыяд, калі нямецкія войскі былі на подступах да Масквы ў розных раёнах Беларусі, патрыёты як па асабістай ініцыятыве, так і па рашэнню падпольных груп і арганізацый, працягваючы даваенную традыцыю, надавалі важнае значэнне галоўнаму савецкаму святу і ўсяляк імкнуліся годна яго адзначыць. І калі да вайны свята сустракалі высокімі працоўнымі паказчыкамі, іншымі навуковымі і творчымі дасягненнямі, паказчыкамі сацыялістычнага спаборніцтва, то з пачаткам акупацыі тэрыторыі Беларусі адносіны насельніцтва да савецкіх святаў сталі разглядацца як своеасаблівая форма супраціву, падтрымкі савецкага ладу жыцця і пратэсту супроць прысутнасці акупантаў. Яна выражалася ў тым, што патрыёты рыхтавалі і распаўсюджвалі ўлёткі, зводкі савецкага інфармацыйнага бюро, вывешвалі на будынках, у тым ліку на будынках, дзе размяшчаліся органы акупацыйнай улады і паліцыі, чырвоныя сцягі і г.д. Вышэйшай формай лічылася правядзенне падпольшчыкамі і партызанамі дыверсій і баявых аперацый, прысвечаных чарговай гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Так, у канцы кастрычніка 1941 г., напярэдадні 24-й гадавіны Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, Мінскі падпольны абкам партыі прыняў рашэнне аб разгроме варожага гарнізона ў раённым цэнтры Любань. Да ўдзелу ў аперацыі былі прыцягнутыя партызаны атрадаў Аляксандра Іванавіча Далідовіча, Мікалая Мікалаевіча Розава, Аляксея Іванавіча Патрына, груп Георгія Мікалаевіча Сталярова і Аляксандра Іосіпавіча Мілевіча ў колькасці 83 узброеных байцоў. У ноч на 7 лістапада яны здзейснілі раптоўнае нападзенне на гарнізон, які налічваў каля 90 чалавек. Бясшумна зняўшы вартавых, партызаны атакавалі гранатамі казарму і камендатуру. У выніку амаль двухгадзіннага бою было знішчана 42 гітлераўцы, захоплена шмат зброі і боепрыпасаў, а таксама харчавання. Ім удалося вывезці з райцэнтра ўсё абсталяванне друкарні. На будынку даваеннага райвыканкама быў узняты чырвоны сцяг. У баі партызаны страцілі кулямётчыка А. М. Беляўскага [11, с. 133; 12, арк. 10–14].

У гэты ж дзень на поўначы Беларусі ў в. Грамошчы Верхнедзвінскага раёна на будынку школы таксама залунаў чырвоны сцяг. Вось як аб гэтым расказвае былы начальнік штаба 1-га Калінінскага атрада 2-й Дрысенскай партызанскай брыгады Уладзімір Аляксандравіч Несцярэнка: «Аднойчы камсамольцы сабраліся на сваю чарговую сходку ў вёсцы Грамошча. Пачаў яе Ілья Усцінавіч Мядзель: “Віншую вас са святам гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Мы гэты дзень павінны адзначыць па даўняй традыцыі. На школе заўсёды развяваўся чырвоны сцяг, а побач праходзіў мітынг. На гэты раз прыйдзецца абысціся без мітынга. Але сцяг трэба вывесіць, каб людзі адчувалі, што Савецкая ўлада жыве і ніякая сіла яе не знішчыць. Раніцай 7 лістапада 1941 г. жыхары вёскі Грамошча з хваляваннем назіралі як на будынку школы развяваўся чырвоны сцяг”» [13, с. 4].

Дакументы і ўспаміны былых удзельнікаў патрыятычнага падполля сведчаць аб тым, што ў розных рэгіёнах акупаванай тэрыторыі Беларусі патрыёты па асабістай ініцыятыве імкнуліся адзначыць свята.

*Нашы сходы праводзіліся ў асноўным па начах, у загадзя ўмоўленым месцы – у яры, у лазні, у хляве, у лесе,* – успамінаў былы кіраўнік Полаўскай падпольнай камсамольскай арганізацыі «За Радзіму» Генадзь Канстанцінавіч Лысёнак. – *У канцы кастрычніка 1941 г. на могілках абмеркавалі пытанне аб падрыхтоўцы да 24-й гадавіны Вялікага кастрычніка. Вырашылі гэтую дату адзначыць баявымі справамі. Маладыя патрыёты спалілі вакзал на станцыі Полава, знішчылі вялікі ўчастак тэлефонна-тэлеграфнай сувяз*і [14, с. 446].

Былыя арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Гомельшчыне, Героі Савецкага Саюза Ілля Паўлавіч Кожар і Емельян Ігнацьевіч Барыкін адзначалі, што да 24-й гадавіны Кастрычніка атрады «Бальшавік» і «За Радзіму» Гомельскай вобласці мелі на сваім баявым рахунку да 40 знішчаных і спаленых аўтамашын, 3 самалёты, дзесяткі разбураных мастоў, сотні забітых гітлераўцаў [15, с. 227]. Напярэдадні 24-й гадавіны Кастрычніка камандаванне атрада «Бальшавік» разам с Гомельскім сельскім партызанскім атрадам (камандзір А. Ф. Буры) вырашыла разграміць нямецкую гаспадарку, створаную на базе былога саўгаса імя Горкага, дзе гітлераўцы сабралі шмат зерня і прадуктаў

жывелагадоўлі. Для аховы быў створаны карны атрад з ліку здраднікаў. Пры прыбліжэнні партызан ахоўнікі разбегліся і баявой сутычкі не адбылося. *Тым не менш карысць ад аперацыі была вялікая. Мы з Е. І. Барыкіным,* – успамінаў пазней былы сакратар Гомельскага падпольнага абкама партыі А. А. Куцак, – *правялі мітынг рабочых саўгаса, расказалі аб баявых дзеяннях партызан і гераічнай барацьбе Чырвонай Арміі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Нашыя таварышы захапілі ўсю «канцылярыю» карнікаў, папоўнілі харчовыя рэсурсы атрада. Сярод захопленых папер быў знойдзены спіс камуністаў, складзены здраднікам П. Кручковым для адпраўкі ў гомельскую камендатуру. Здраднік быў намі знойдзены і панес заслужанае пакаранне. Неабходна адзначыць, што вестка аб гэтай аперацыі партызан абляцела ўсю акругу* [16, с. 115]. Далей А. А. Куцак узгадвае, што атрад фактычна не меў праўдзівай інфармацыі аб падзеях на фронце. І толькі напярэдадні 7 лістапада ўдалося сабраць з розных дэталяў радыепрыемнік. *І вось раніцай 7 лістапада мы сабраліся ў землянцы. Затаіўшы дыханне, слухалі голас роднай Масквы – у гонар 24-й гадавіны Вялікага Кастрычніка ў сталіцы нашай Радзімы адбыўся ваенны парад, на якім з прамовай выступіў Вярхоўны Галоўнакамандуючы І. В. Сталін. Ніякія словы не здольны выразіць таго воодушевленія, радасць і ўздым, якія панавалі ў нашым асяродку. Родная Масква жыве, змагаецца*! [16, с. 116].

Адзначыліся баявымі дзеяннямі да гэтага часу і партызаны паўднёвых раёнаў Палескай вобласці: партызанскі атрад Капаткевіцкага раёна пад камандаваннем Мікалая Іосіфавіча Гардзіенкі ўзарваў склад з боепрыпасамі ў в. Філіпавічы. Петрыкаўскі атрад пад камандаваннем Х. І. Варгаўціка ў верасні знішчыў параход на р. Прыпяць. Лельчыцкі партызанскі атрад у пачатку верасня 1941 г. у баі каля Лельчыцаў знішчыў звыш 35 гітлераўцаў. Па сведчанні былых арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Палескай вобласці І. Д. Ветрава і М. І. Малініна, акрамя баявых дзеянняў партызаны сістэматычна праводзілі сярод насельніцтва працу па выкрыццю ілжывай варожай прапаганды аб становішчы на франтах, аб мэтах і задачах акупацыйнай палітыкі. Камандаваннем Скараднянскага партызанскага атрада Ельскага раёна Палескай вобласці было арганізавана правядзенне 6–7 ліста-пада 1941 года ў вёсках раёна ганаровых сходаў. На сходзе ў в. Скароднае прысутнічалі ўсе яе жыхары. У святочна ўпрыгожаным клубе віселі партрэты У. І. Леніна, кіраўнікоў партыі і ўрада, на будынку развяваўся чырвоны сцяг. *Пасля даклада камандзіра атрада – былога старшыні калгаса Пятра Мікалаевіча Рагазенка – жыхары запрасілі партызан да сябе ў госці. Моладзь на святочным вечары пела савецкія песні, паказываючы тым самым, што ні тэрорам, ні подлымі сродкамі абману фашыстам не ўдаецца запрыгоніць савецкіх людзей, зламаць іх волю да супраціву* [17, с. 147].

Дакументы сведчаць, што падпольшчыкі, якія дзейнічалі ў розных раёнах Беларусі, імкнуліся па свойму адзначыць свята. Так, напярэдадні 24-й гадавіны Кастрычніка маладыя патрыёты Мікалай Цыро і Уладзімір Бернатовіч вырашылі здзейсніць дыверсію на чыгунцы. Ноччу з 6 на 7 лістапада 1941 года яны выцягнулі кастылі і раз’ядналі стык рэек. *Буйной аварыі тады*

*не адбылося* – ўспамінае былы падпольшчык Генадзь Капусцёнак, – *паравоз рабіў манеўры і з рэек зышоў адзін вагон. Аднак рабяты і гэтаму былі рады – нейкую страту нанеслі ворагу* [18, с. 45].

Партызаны і падпольшчыкі рыхтаваліся да свята 7 лістапада яшчэ не ведаючы, што на самай справе адбываецца на фронце. Нямецкая прапаганда трубіла аб тым, што з дня на дзень Масква будзе захоплена. Таму вестка аб тым, што ў Маскве адбылося святкаванне 24-й гадавіны Вялікай кастрычніцкай рэвалюцыі ў вельмі крытычны і адказны для СССР, а па вялікаму рахунку і для ўсяго свету час, калі нямецкія войскі прарваліся на подступы да Масквы, мела для насельніцтва часова акупіраванай тэрыторыі вельмі вялікае значэнне. Для таго каб уявіць сабе, як маглі б разгортвацца падзеі ў выпадку захопу немцамі Масквы, дастаткова ўспомніць сітуацыю лютага 1918 г., калі кайзераўскія войскі падышлі да Петраграда. Як маглі разгортвацца падзеі, калі б раптам савецкае кіраўніцтва запрасіла, ці немцы прапанавалі заключэнне «другога Брэсцкага міру»? Відавочна, што далейшыя сцэнарыі развіцця Другой сусветнай вайны і яе вынікі маглі быць зусім іншымі. Аднак гэта ўжо «сослагательное наклонение», а мы гісторыю даследуем пакуль традыцыйнымі сродкамі, таму вернемся да восеньскіх падзей 1941 г. у Маскве.

Адзначым, што падрыхтоўка да святкавання ў сталіцы адбывалася сакрэтна.

З успамінаў генерал-палкоўніка П. А. Арцем'ева: *У ноч з 30 на 31 кастрычніка 1941 года я, як камандуючы войскамі Маскоўскай ваеннай акругі і Маскоўскай зоны абароны, быў з дакладам у Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Сталін спытаў, ці рыхтуемся мы да параду войскаў Маскоўскага гарнізона ў гонар 24-й гадавіны Кастрычніка. Я, памятаецца, не схаваў цяжкасцяў, спаслаўшыся на складаную ваенную абстаноўку і адсутнасць дастатковай колькасці войскаў. У адказ мне было сказана, што трэба ацэньваць палітычнае значэнне такога параду. І быў дадзены загад: парад рыхтаваць, неабходныя для яго войскі адшукаць ... Аб парадзе ніхто не павінен ведаць, акрамя строга абмежаванага кола асоб* [19, с. 45].

Камандаваць парадам было даручана П. А. Арцем'еву, а прымаць парад – Маршалу Савецкага Саюза С. М. Будзённаму.

А вось радкі з успамінаў каменданта г. Масква, нашага земляка, ураджэнца г. Лоева, генерал-маёра Кузьмы Раманавіча Сінілава: *За некалькі дзён нам было вядома аб тым, што мяркуецца парад. Яго трэба было рыхтаваць так, каб ніхто не ведаў. Складанасць была ў тым, что мало часу было. Звычайна падрыхтоўка да параду займае ў мірны час паўтара-два месяцы, а тут за некалькі дзён трэба было падрыхтавацца.*

*На парадзе, як і ў мірны час, былі прадстаўлены ўсе роды войскаў. Была прызначана і авіяцыя да парада, але перашкодзіла надвор'е ... Адзінае, чым вонкава адрозніваўся парад, – гэта адсутнасць дэманстрацыі. Гэты парад выклікаў вялікае захапленне ва ўсяго народа. У мірны час гэта было традыцыяй, а падчас вайны ён быў нечаканасцю і надаў святу большую ўрачыстасць. Уздым у народа і войскаў быў незвычайны. Пасля параду была*

*аб'яўлена падзяка ўсім удзельнікам і выдалі па сто грамаў. Людзі выпілі, паабедалі і пайшлі на фронт. Пасля параду адбыўся пералом у размовах, настроях, нават вонкава пералом быў заўважаны. Тое, што адбылося ў свядомасці, унутры (у сярэдзіне) кожнага, знайшло адлюстраванне ў паводзінах. 7-га і ў наступныя дні народ стаў зусім іншым: жыццярадасны, усмешлівы, асаблівая цвёрдасць з'явілася, упэўненасць* [19, с. 13–14].

**У свядомасці многіх савецкіх людзей усталявалася перакананне, што без парада 7 лістапада 1941 года не было б і парада Перамогі ў 1945 годзе.** Няма сэнсу спрачацца з гэтым. Несумненна, што сам факт яго правядзення меў сусветна-гістарычнае значэнне, і тут трэба пагадзіцца з ацэнкай, якая была выказана 8 лістапада у англійскай газеце «Дейлі Мейл»: *Сталін арганізаваў на знакамітай Чырвонай плошчы адну з самых бліскучых дэманстрацый мужнасці і перакананасці, якая толькі мела месца ў час вайны*.

Вядома, што ў кастрычніку адбывалася эвакуацыя важнейшых устаноў з Масквы на Усход, у тым ліку скарочаных партыйных і дзяржаўных апаратаў БССР. Ніхто не мог гарантаваць, што могуць зрабіць немцы ў дні святкавання. **Зыходзячы з гэтага, сам факт правядзення 6 лістапада 1941 г. ўрачыстага пасяджэння Маскоўскага Савета дэпутатаў працоўных з партыйнымі і грамадскімі арганізацыямі г. Масквы, прысвечанага 24 гадавіне, і тое, што на ім з дакладам выступіў І. В. Сталін, меў вялізарнае палітычнае і міжнароднае значэнне.** У дакладзе на пасяджэнні ён даў ацэнку і падвёў вынікі вайны за чатыры месяцы, упершыню назваў лічбы страт, якія панесла краіна, і выказаў непахісную ўпэўненасць у перамозе. Сёння, праз амаль 80 гадоў пасля таго, як яго змест быў агучаны ў зале паседжання, а затым растыражыраваны і распаўсюджаны па ўсёй тэрыторыі СССР і за яго межамі, пасля той інфармацыі, якая сёння нам вядома аб сітуацыі ў свеце і на савецка-германскім фронце на той момант, пра інсінуацыі ў адносінах да Чырвонай Арміі і да палітыкі СССР многія яго тэзы ўспрымаюцца як прароцкія.

Бадай, за ўсю сваю гісторыю Савецкая краіна не была ў такім становішчы. Гаворачы аб гэтым, Сталін у раздзеле «Разгром нямецкіх імперыялістаў і іх армій немінучы» назваў *тры асноўныя фактары, сіла якіх расце з дня ў дзень і якія павінны прывесці ў недалёкім будучым да разгрому гітлераўскага разбойніцкага імперыялізма. Гэта, па-першае,* ***нетрываласць «новага парадку» ў Еўропе****...*

*Гэта, па-другое,* ***нетрываласць тылу гітлераўскіх захопнікаў. Пакуль*** *гітлераўцы займаліся збіраннем Германіі, разбітай на кавалкі ў сілу Версальскага дагавора, яны маглі мець падтрымку германскага народа, натхненнага ідэалам аднаўлення Германіі. Але пасля таго, як гэтая задача была вырашана, а гітлераўцы сталі на шлях імперыялізма, на шлях захопу чужых зямель і пакарэння чыжых народаў, ператварыўшы народы Еўропы і народы СССР у заклятых ворагаў цяперашняй Германіі, – у германскім народзе адбыўся глыбокі пералом супроць прадаўжэння вайны, за ліквідацыю вайны...*

***Гэта, нарэшце, кааліцыя СССР, Вялікабрытаніі і Злучаных Штатаў Амерыкі супроць нямецка-фашысцкіх імперыялістаў.*** *Гэта факт, што Вялікабрытанія, Злучаныя Штаты Амерыкі і Совецкі Саюз аб'ядналіся ў адзіны лагер, які паставіў сабе мэтайт разгром гітлераўскіх імперыялістаў і іх захопніцкіх армій...* [20, с. 32–35].

У раздзеле «Нашы задачы» І. В. Сталін падкрэсліў, што немцы вядуць *несправядлівую захопніцкую вайну, разлічаную на захоп чужой тэрыторыі і пакарэнне чужых народаў. Таму ўсе сумленныя людзі павінны падняцца супроць нямецкіх захопнікаў як ворагаў.* ***У адрозненне ад гітлераўскай Германіі Савецкі Саюз і яго саюзнікі вядуць вайну вызваленчую, справядлівую, разлічаную на вызваленне заняволеных народаў Еўропы і СССР ад гітлераўскай тыраніі...***

*У нас няма і не можа быць такіх мэт вайны, як захоп чужых тэрыторый, пакарэнне чужых народаў, усё роўна, ці ідзе гутарка аб народах і тэрыторыях Еўропы, ці аб народах і тэрыторыях Азіі, у тым ліку і Ірана... У нас няма і не можа быць такіх мэт вайны, як навязванне сваёй волі і свайго рэжыма славянскім і іншым заняволенным народам Еўропы, якія чакаюць ад нас дапамогі. Наша мэта заключаецца ў тым, каб дапамагчы гэтым народам у іх вызваленчай барацьбе супроць гітлераўскай тыраніі і потым даць ім магчымасць зусім свабодна ўпарадкавацца на сваёй зямлі так, як яны хочуць. Ніякага ўмяшання ва ўнутраныя справы іншых народаў Але, каб ажыццявіць гэтыя мэты, трэба сакрушыць ваенную магутнасць нямецкіх захопнікаў, трэба знішчыць усіх нямецкіх акупантаў да аднаго, якія прабраліся на нашу радзіму для заняволення!* (бурныя працяглыя апладысменты) [20, с. 36–37].

Таму зусім не выпадкова, што галоўным сімвалам ці трэндам савецкай прапаганды сталі словы аднаго з заклікаў даклада: «Наша справа справядлівая, – перамога будзе за намі!» (Наше дело правое, - победа будет за нами!) [Там жа, с. 16–38].

Кульмінацыйным момантам свята, як гэта было і ў даваенныя гады, была падрыхтоўка і правядзенне 7 лістапада вайсковага парада. Галоўнай адметнай асаблівасцю было тое, што вайсковыя часці – удзельнікі парада на Краснай плошчы адразу рухаліся на баявыя пазіцыі.

Нават праз шмат дзесяцігоддзяў цяжка пераацаніць значэнне гэтай падзеі для патрыятычных настрояў насельніцтва Савецкага Саюза. Вядома, што 7 лістапада 1941 г. вайсковыя парады прайшлі ў многіх гарадах Савецкага Саюза. 9 лістапада газета «Праўда» надрукавала прамову Маршала Савецкага Саюза К. Я. Варашылава на парадзе ў г. Куйбышаў, у якой ёсць словы *нашыя браты ўкраінцы, беларусы, малдаване, літоўцы, латышы, эстонцы, карэлы, якія часова папалі пад ярмо нямецка-фашысцкіх захопнікаў, арганізуюць партызанскую барацьбу супроць сваіх насільнікаў і парабаціцеляў*, адзначаецца, што «ўжо зараз партызаны з'яўляюцца кашмарам для тыла германскіх войск, аднак партызанская вайна толькі пачынаецца, яна разрастаецца ў сапраўдную і смяротную барацьбу супроць захопнікаў».

**Асабліва важнае значэнне для насельніцтва акупаванай тэрыторыі мела вестка аб святкаванні і парадзе на Краснай плошчы.** Таму, калі тут стала вядома аб выступленнях Сталіна і парадзе ў Маскве, партызаны і падпольшчыкі, усе патрыятычна настроенныя жыхары шырока выкарыстоўвалі гэты факт для абвяржэння паведамленняў нямецкай прапаганды аб узяцці немцамі Масквы. Асабліва актывізавалася гэтая праца пасля таго, як стала вядома аб перамозе Чырвонай арміі ў Маскоўскай бітве.

Успамінаючы аб гэтых днях, Герой Савецкага Саюза, адзін з кіраўнікоў Бабруйскага падполля і камандзір 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады Віктар Ільіч Лівенцаў пісаў: *У гэтыя дні фашысты распаўсюджвалі ў горадзе слых, што імі ўжо ўзятыя Масква і Ленінград і што ідуць баі толькі па ачыстцы гэтых гарадоў ад разрозненых груп савецкіх войскаў. Ці трэба казаць, якое гнятлівае ўражанне зрабіла гэта паведамленне на ўсё грамадзянскае насельніцтва. Мы, спасылаючыся на савецкае радыё, распаўсюдзілі сваю зводку з паведамленнем аб парадзе войскаў Чырвонай Арміі 7 лістапада 1941 года ў Маскве на Краснай плошчы... З вялікай радасцю сустрэлі жыхары Бабруйска нашу ўлётку з паведамленнем пра наступ Чырвонай Арміі пад Масквой у снежні 1941 года. Людзі акрыялі духам, пераканаліся ў ілжывасці варожай прапаганды аб узяцці Масквы. Па-іншаму сталі паводзіць сябе нават немцы (а яны-то ведалі праўду!). Прызадумаліся і многія здраднікі, што працавалі ў паліцыі, управе і яе аддзелах* [21, с. 54].

Усюды, дзе дзейнічалі партызанскія групы і атрады, патрыётамі ў вёсках праводзіліся сходы і мітынгі, на якіх даводзілася інфармацыя аб сапраўдным становішчы на франтах. Насельніцтва даведалася, што гітлераўскія планы бліцкрыга з трэскам праваліліся, Масква не толькі правяла партызанскі парад, але і здолела адкінуць нямецкія войскі на сотні кіламетраў ад сталіцы.

Акрамя гэтага на сходах чыталіся даклады «Задачы партызанскай барацьбы», «Дапамога насельніцтва партызанам», «Савецкая ўлада непераможна», праводзіліся гутаркі аб сутнасці акупацыйнага рэжыму і г.д. Каля 100 сходаў восенню–зімой 1941 года было праведзена ў вёсках Клічаўскага і Асіповіцкага раёнаў Магілеўскай вобласці. Не засталося без належнай увагі насельніцтва ў Ленінскім раёне Пінскай вобласці, Жыткавіцкім і Акцябрскім – Палескай вобласці, Старобінскім раёне Мінскай, Суражскім, Ушацкім і Расонскім раёнах Віцебскай вобласці, а таксама ў шэрагу іншых месцах, дзе дзейнічалі партызаны [22, с. 93].

Успамінаючы аб першых месяцах дзейнасці падполля, былы сакратар Мазырскага падпольнага райкама партыі Міхаіл Кузьміч Ільінкоўскі ўспамінаў: «Асаблівае значэнне набыла тады барацьба з гебельсаўскай ілжывай прапагандай. Ваенную перамогу мы атрымалі пазней. Маральную – ужо ў першыя тыдні акупацыі. Менавіта гэтая перамога ў барацьбе за розумы і сэрцы людзей забяспечыла поспехі партызанскага руху, менавіта ў гэтай перамозе адна з самых вялікіх заслуг камуністаў і патрыётаў, райкамаў партыі і партыйных арганізацый у тыле ворага» [23, с. 29].

Дакументы сведчаць, што таксама шырока, на хвалі паведамленняў аб перамогах Чырвонай арміі пад Масквой, партызанамі і падпольшчыкамі, насельніцтвам Беларусі ў 1942 г. адзначаліся савецкія святы. Так, 17 лютага пар-

тызаны атрадаў «Чырвоны Кастрычнік», І. Р. Жулегі, А. Ц. Міхайлоўскага, А. Ф. Каваленкі разграмілі варожы гарнізон ў мястэчку Азарычы. 22 лютага 1942 г. гэтымі отрадамі быў ліквідаваны гарнізон на станцыі Муляраўка, адзначыўшы тым самым свята 24-й гадавіны Чырвонай арміі. Было знішчана 37 салдат і афіцэраў праціўніка [24, с. 603, 605; 25, с. 61].

Напярэдадні свята ў партызанскай тыпаграфіі атрада В. І. Лівенцава былі надрукаваны некалькі соцен лістовак з тэкстам партызанскай прысягі. 23 лютага ў вёсцы Былкава, дзе дыслакаваўся ў той час атрад, адбыўся мітынг, прысвечаны гэтай падзеі. Над домам, дзе знаходзіўся штаб атрада, лунаў чырвоны сцяг. На вуліцы сабраліся ўсе жыхары вёскі. На прасторным калгасным двары быў пастроены атрад з поўным баявым узбраеннем. Сярод байцоў атрада былі амаль усе жыхары Былкава, здольныя насіць зброю. Пасля выступлення камісара атрада Д. А. Ляпешкіна пачалося ганаровае прынящце партызанскай прысягі. Першым яе прыняў камандзір атрада В. І. Лівенцаў [21, с. 29].

Дакументы сведчаць, што адной з форм палітычнай працы Кампартыі Беларусі з’яўляліся арганізацыя, распаўсюджванне і паўсяместная прапагада загадаў І. В. Сталіна, зваротаў ЦК КП(б)Б, СНК і Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР да партызан і насельніцтва Беларусі, якія ўтрымлівалі заклікі шырэй разгортваць народную барацьбу ў тыле ворага. «Усе, хто толькі можа насіць зброю, ад мала да вяліка – гаварылася ў звароце ад 30 сакавіка 1942 года, – падымайцеся на свяшчэнную ўсенародную барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў! За нашу родную Савецкую Беларусь! За нацыянальную незалежнасць! За шчасце нашых дзяцей!» [26, с. 32].

Шырока абмяркоўваўся на мітынгах і сходах першамайскі зварот ЦК КП(бБ) і ўрада БССР, у якім яны заклікалі працоўных Беларусі ўзмацніць удары па ворагу, падняць народнае паўстанне ў тыле фашысцкіх захопнікаў, усе сілы аддаць на канчатковы разгром крывавага фашызма [24, с. 171–172].

Таксама ў складаных абставінах для краіны адбывалася святкаванне ў Маскве юбілейнага 25-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Нямецкія войскі летам-восенню 1942 г. захапілі вялізныя тэрыторыі, прарваліся да Сталінграда і прадгор’яў Каўказа, імкнучыся захапіць нафтавыя раёны Грознага и Баку. Аднак рэальнай пагрозы непасрэдна для Масквы ўжо не існавала. Войскі группы армій «Цэнтр» у выніку зімне-вясенняга наступлення Чырвонай арміі былі адкінуты больш за 400 км ад сталіцы. Таму ў сваім дакладзе на ўрачыстым паседжанні Маскоўскага Савета, якое адбылося 6 лістапада 1942 г., І. В. Сталін падрабязна спыніўся на падзеях за мінулы год. Сур’ёзныя поспехі, якія немцы атрымалі летам 1942 г., ён патлумачыў тым, што, дзякуючы адсутнасці другога фронта ў Еўропе, немцы змаглі стварыць значны перавес сіл на паўдёва-заходнім накірунку. Праводзячы гістарычныя паралелі з падзеямі Першай сусветнай вайны, калі Германія ваявала на два франты, трэба сказаць, што яна выставіла супраць русскага фронта 127 дывізій, а ў сучаснай вайне Германія, ваюючы на адным фронце, кінула на савецка-германскі фронт да 240 дывізій. «Я думаю, адзначыў І. В. Сталін, – што ніякая іншая краіна і ніякая іншая армія не змаглі б вытрымаць падобны націск азвярэлых банд нямецка-фашысцкіх разбойнікаў і іх саюзнікаў. Толькі наша Савецкая краіна і толькі наша Чырвоная

армія здольны вытрымаць такі націск. І не толькі вытрымаць, але і пераадолець яго» [27, с. 69–70]. Даклад быў працяты ўпэўненым аптымізмам аб непазбежнай перамозе над ворагам, сведчаннем чаго стаў пераход праз некалькі дзён Чырвонай арміі ў контрнаступленне пад Сталінградам, акружэнне і разгром моцнай варожай групоўкі войск.

А што ў гэты час адбывалася ў Беларусі? З вясны 1942 г. тут адбываецца шырокае развіццё падпольнай барацьбы і партызанскага руху. У сувязі з напружаннем пад Сталінградам немцы былі вымушаны перакінуць на ўсход значную колькасць сваіх вайсковых сіл, аслабіўшы іх прысутнасць на тэрыторыі Беларусі. Гэтаму спрыяла таксама ўзрослая дапамога савецкага тыла партызанам з боку Цэнтральнага (ЦШПР) і Беларускага штабоў партызанскага руху, увогуле савецкага тыла. Падрыхтоўцы арганізацыі святкавання спрыялі апублікаваныя ў кастрычніку 1942 г. заклікі ЦК УКП(б) у сувязі з 25-й гадавінай Кастрычніка. У іх былі і заклікі да насельніцтва акупаваных тэрыторый: «Браты і сёстры! Рускія і украінцы, беларусы, малдаване, літоўцы, латышы, эстонцы, карэлы, часова папаўшыя пад ярмо нямецка-фашысцкіх мярзотнікаў! Бязлітасна знішчайце фашысцкіх захопнікаў, раздувайце полымя ўсенароднага партызанскага руху».

Падпольныя партыйныя органы шырока выкарыстоўвалі заклікі для разгортвання працы па святкаванню 25-й гадавіны. Фактычна ў дакументах усіх партызанскіх фарміраванняў, падпольных партыйных і камсамольскіх органаў, у падпольным друку маюцца звесткі аб актывізацыі баявой і масава-палітычнай работы партызан і падпольшчыкаў напярэдадні і ў гонар свята.

Дакументы сведчаць аб тым, што напярэдадні свята Кастрычніка, як і ў мірны час, у партызанскіх зонах і фарміраваннях шырокае развіццё атрымала «сацыялістычнае» спаборніцтва за лепшыя паказчыкі ў барацьбе з ворагам, якое шырока асвятлялася ў партызанскім і падпольным друку, рукапісных выданнях.

Паўсюдна ў населеных пунктах ў партызанскіх зонах адбыліся мітынгі, сходы, сустрэчы, кіраўнікі атрадаў і брыгад; камісары, прапагандысты і агітатары выступалі з дакладамі, прысвечаныя гэтай даце. Толькі ў Мінскай вобласці такія сходы адбыліся ў 276 весках. У 18 буйных населеных пунктах праведзены мітынгі, на якія прыбылі калоны партызан са сцягамі і транспарантамі з заклікамі. Аб тым, які размах набыла масава-прапагандысцкая дзейнасць, сведчаць дадзеныя справаздачных дакументаў.

У другім паўгоддзі 1942 г. ў весках Суражскага, Гарадоцкага, Дрысенскага, Расонскага і іншых раёнаў Віцебскай вобласці было праведзена 850 сходаў і мітынгаў. На сходах у 109 вёсках Рудзенскага, Пухавіцкага і Грэскага раёнаў у верасні-кастрычніку прысутнічала каля 45 тысяч чалавек [28, с. 87–88]. Толькі ў Магілёўскай вобласці з верасня 1942 па май 1943 года было прачытана каля 5 тысяч лекцый і дакладаў. Дзесяць партызан атрымалі раненні. Страты праціўніка наступныя: 25 чалавек забітыя і 5 параненыя [29, арк. 112].

Як гэта не парадаксальна, але складваецца ўражанне, што ў асобных раёнах і населеных пунктах акупаванай ворагам тэрыторыі Беларусі падрыхтоўка да святкавання 25-годдзя Кастрычніка, іншых савецкіх святаў адбывалася яшчэ з большым энтузіязмам, чым гэта рабілася да вайны. Гэта ў першую чаргу

тлумачыцца як усё ўзрастаючай баявой і палітычнай актыўнасцю партызанскага руху, так і запатрабаванасцю, жаданнем насельніцтва пачуць праўдзівую інфармацыю аб падзеях на франтах, аб савецкім тыле, выказаць яму сваю падтрымку. Не выпадкова ў сваёй кнізе «Партызанская рэспубліка» былы начальнік БШПР П. З. Калінін адзначаў пазней, што ў шэрагу акупаваных раёнаў «размах масава-палітычнай працы быў настолькі шырокім, што мясцовыя жыхары часам гаварылі: «Да нас нават у мірны чыс дакладчыкі прыязджалі нашмат радзей (гораздо реже), чым зараз. У сапраўднасці так і было» [29, с. 271].

Адзначым, што з першых дзён вайны мітынгі з'яўляліся распаўсюджанай і даволі эфектыўнай ідэйна-выхаваўчай формай працы.

Звычайна яны праводзіліся з нагоды ажыццяўлення рэвалюцыйных і іншых савецкіх святаў непасрэдна ў партызанскіх фарміраваннях, у населенных пунктах партызанскіх зон, а таксама ў іншых месцах, дзе прадстаўлялася магчымасць. У шэрагу партызанскіх фарміраванняў мітынгі (сходы) праводзіліся перад выхадам на баявую аперацыю, а таксама пасля яе ўдалага правядзення. У кароткай прамове камандзір (камісар) ці прадстаўнік вышэйшага (партыйнага, камсамольскога і інш.) органа гаварыў аб важнасці і значнасці моманту, ставіў канкрэтную задачу і заклікаў да паспяховага яе выканання. Пасля гэтага з кароткімі прамовамі-заклікамі маглі выступіць яшчэ 1–2 прадстаўніка партызан (у тым ліку жанчыны). Асаблівае ўздзеянне на патрыятычную свядомасць аказвалі мітынгі, якія праводзіліся пры пахаваннях. Клятвы партызан на магілах сваіх сяброў, загінуўшых у баях, мірных жыхароў, растраляных, замучаных, спаленых падчас карных экспедыцый фашыстамі, часта іх родных і блізкіх, аказвалі моцнае эмацыйнае ўздзеянне. Прысутныя на мітынгах і сходах не толькі слухалі выступаючага, які з'яўляся прадстаўніком камадна-палітычнага складу, прапагандыстам ці агітатарам, але, пад уздзеяннем пачутага, самі бралі слова для выступлення, прымаючы на сябе канкрэтныя баявыя і іншыя абавязкі. Мясцовыя жыхары нярэдка прымалі на сябе асабістыя і калектыўныя абавязкі аб дапамозе партызанам, аб сабатаванні акупацыйных мерапрыемстаў, аб уступленні ў партызанскія атрады і фарміраванні мясцовай самаахковы. Так, пры вызваленні ў кастрычніку 1942 года партызанамі раённага цэнтра Ушачы мясцовыя жыхары сустрэлі іх з кветкамі і бюстам У. І. Леніна, а пасля арганізаванага партызанамі мітынга 200 жыхароў былі залічаны ў партызаны [24, с. 486–487]. Як і ў даваенны час, з 23 кастрычніка 1942 года ў вызваленым ад захопнікаў раённым цэнтры Ушачы, на вуліцах і цэнтральнай плошчы, залуналі чырвоныя сцягі [30, с. 183]. Як бачна з дакладной запіскі сакратара Ушацкага падпольнага РК ЛКСМБ Уладзіміра Якаўлевіча Васілеўскага аб рабоце райкама і барацьбе насельніцтва з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў кастрычніку – снежні 1942 года, 6 лістапада партызанамі ў гарадскім скверы было здзейснена перапахаванне ў брацкай магіле ахвяр фашызму, якія былі закапаныя ў двары былога двара дома міліцыі. «На магіле, над трупамі па-зверску закатаваных фашыстамі патрыётаў Радзімы я выступіў з прамовай. Пасля

мяне выступіў стары з сівай барадой, які абапіраўся на палку. Калі ён загаварыў, не хацелася верыць, што гэта кажа сівы стары. У сваёй прамове ён сказаў: "сынкі і дочкі мае, унукі мае, слухайце мяне, які пражыў і многа бачыў за век свой. Страшэннае гора напаткала нас у мінулы год. Сабачыя орды немцаў, драпежныя і лютыя звяры напалі на нас. Упершыню ў жыцці я ўбачыў шыбеніцу, на якой віселі зсінелыя дачкі і сыны нашы. Мы бачылі масавыя расстрэлы ні ў чым не вінаватых людзей. Бацькі і маці, жонкі і дзеці-сіроты! Не плачце над трупамі ахвяр фашызму. Яны загінулі за справу нашай Радзімы, загінулі як героі. Адпомсціце ж, таварышы! Усе, як адзін, за зброю, у партызанскія атрады! Біце праклятых гадаў, сынкі і дачушкі мае! Бывайце, таварышы! Мы не забудзем вас і вашыя сем'і. Смерць немчуры!» [24, с. 487].

Як бачна са справаздачы У. Я. Васілеўскага, на брацкай магіле быў пастаўлены абеліск з пяціканцовай зоркай, а яна абнесена «красивой изгородью».

Шматлікія дакументы і ўспаміны сведчаць, што рэвалюцыйныя даты 25-га і 26-га юбілеяў Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, а таксама іншыя савецкія святы партызанскія фарміраванні і падпольшчыкі імкнуліся адзначыць баявымі дзеяннямі, дыверсіямі, іншымі актамі выражэння свайго варожага стаўленя да акупантаў і іх палітыкі.

Так, партызанскія атрады імя І. В. Сталіна і імя В. І. Чапаева Баранавіцкай вобласці 4 лістапада 1942 г. разграмілі варожы гарнізон ў мястэчку Вішнева Валожынскага раёна. За лістапад 1942 г. агітатарамі было прачытана каля 200 дакладаў і праведзена шмат гутарак з насельніцтвам раёна.

У населеных пунктах Палескай і Мінскай абласцей было падрыхтавана і вывешана 738 заклікаў ЦК УКП(б) і 1 380 плакатаў, лістовак, зводак СавІнфармбюро. Партызанская агітбрыгада правяла 17 святочных канцэртаў сярод насельніцтва і партызан. Такія агітбрыгады меліся і ў іншых абласцях. У асобных населеных пунктах пасля мітынга адбыліся парады партызан. Напрыклад, 7 лістапада 1942 г. у в. Пушча Полацкага раёна камандаване 5-га партызанскага атрада Сіроцінскай партызанскай брыгады правяло мітынг. На яго арганізавана, як і ў даваенныя гады, з навакольных вёсак прыйшло каля тысячы мясцовых жыхароў, з чырвонымі сцягамі і партрэтамі савецкіх правадыроў. Пасля ўрачыстага мітынга адбыўся своеасаблівы партызанскі парад. Каля святочнай трыбуны і прысутных са зброяй у руках прайшлі байцы атрада, дэманстрыруючы сваю згуртаванасць і гатоўнасць да новых баёў з ворагам [22, с. 313–314].

Напярэдні 25-й гадавіны Вялікага Кастрычніка ў партызанскіх фарміраваннях Расонскай партызанскай зоны прайшлі партыйныя і камсамольскія сходы, а ў населеных пунктах – мітынгі. «Вялікае рэвалюцыйнае свята партызаны азнаменавалі новымі ўдарамі па ворагу. Так, у ноч на 7 лістапада пасля старанна праведзенай разведкі атрады імя К. Я. Варашылава і імя В. І. Чапаева разгромілі варожы гарнізон у вёсцы Каралі Невельскага раёна Калініскай вобласці і, захапіўшы багатыя трафеі, паспяхова вярнуліся на базу» [31, с. 73].

Шэраг баявых аперацый ў гэты час правялі партызаны Пінскага злучэння. Так, атрад В. А. Васільева 30 кастрычніка 1942 г. разграміў варожы гарнізон у Чырвонай Слабадзе, пасля чаго ён больш не аднаўляўся ў гэтым райцэнтры. У канцы кастрычніка была разгромлена чыгуначная станцыя Сінкевічы і ўзарваны чыгуначны мост праз раку Лань. У аперацыі бралі ўдзел атрады М. Т. Шыша і імя С. М. Кірава пад кіраўніцтвам М. І. Герасімава і А. П. Савіцкага. У выніку аперацыі было знішчана 74 гітлераўца, эшалон з авіябомбамі і артылерыйскімі снарадамі, які стаяў на станцыі [32, с. 216].

У верасні–лістападзе 1942 г. партызанамі Беларусі былі падарваны чыгуначныя масты цераз раку Нача на чыгуначнай магістралі Мінск – Орша, цераз раку Шоша на чыгунцы Маладзечна – Полацк, цераз рэкі Талька і Сіняўка на чыгунцы Мінск-Гомель.

Выдатным падарункам святу была ўдалая дыверсійная аперацыя па падрыву 137-метровага чыгуначнага маста праз раку Пціч на магістралі Брэст-Лунінец-Гомель, якая была праведзена раніцай 3 лістапада. Разумеючы стратэгічную значнасць дадзенай магістралі для забяспячэння войскаў групы армій «Поўдзень», якая вяла баявыя дзеянні пад Сталінградам, беларускія партызаны неаднаразова перапынялі рух на ёй. Толькі за перыяд з 24 верасня па лістапад 1942 года на ёй было здзейснена 49 падрываў эшалонаў [33, с. 312]. Але гэтага было недастаткова, каб нанесці значную перашкоду руху цягнікоў. Таму Мінскі падпольны абкам партыі і штаб партызанскага злучэння Мінскай і Палескай абласцей распрацавалі план аперацыі па падрыву чыгуначнага моста праз раку Пціч на ўсход ад станцыі Пціч. Ён атрымаў кодавую назву «Эха на Палессі» і быў ухвалены ЦК КП(б)Б і БШПР. Для яе забяспячэння з Масквы спецыяльным рэйсам даставілі боепрыпасы і ўзрыўчатку, а таксама спецыяльна падрыхтаванага інструктара мінна-падрыўной справы В. П. Шымчонка, які падрыхтаваў некалькі груп падрыўнікоў. У ёй ўдзельнічала 11 партызанскіх атрадаў агульнай колькасцю 1 300 чалавек, у асноўным мясцовых жыхароў, якія складалі большасць сярод народных мсціўцаў. Зранку 3 лістапада 1942 атрады і групы занялі зыходныя пазіцыі. У 6.00 аперацыя пачалася. Бой за авалодванне мастом працягваўся 1 гадзіну 10 хвілін. Нягледзячы на моцны агонь праціўніка, падрыўнікі паклалі пад мост звыш 300 кг узрыўчаткі і падарвалі яго. Праведзеная аперацыя стала шырока вядомай.

У баі пры выкананні задання загінулі камісар 132-га атрада А. А. Тарасаў і 9 партызан: А. Я. Бойко, Ф. П. Гаўрылоўскі, Х. Р. Гарбач, С. Е. Зуеў, Б. Н. Кацубінскі, М. Е. Маскалёў, Г. І. Насановіч, І. С. Талыка, Ф. М. Ющанка. У выніку аперацыі рух на чыгуначнай магістралі быў спынены на 18 сутак, што не дало магчымасці ісці больш 500 эшалонам, зыходзячы з таго, што да гэтага па масту праходзіла 25–30 эшалонаў у суткі [22, с. 411].

Мітынгі і парады ў вызваленых раённых цэнтрах. Пры вызваленні буйных населенных пунктаў, раённых цэнтраў партызаны як правіла, праводзілі мітынгі, а ў рэвалюцыйныя і іншыя святочныя даты – партызанскія парады, якія былі заклікаў паказаць сілу, баявую моц і вывучку партызанскіх падраздзяленняў. Падрыхтоўка да парада і яго правядзенне мелі не толькі

вялікае прапагандысцкае, але і маральна-псіхалагічнае значэнне для партызан і насельніцтва, асабліва для дзяцей і моладзі. Як правіла, гэтая падзея надоўга захоўвалася ў памяці людзей і ўвесь час прысутнічала ва ўспамінах.

Адзін з першых партызанскіх парадаў на тэрыторыі Беларусі быў праведзены ў лістападзе 1942 г. у г. Лоеў Гомельскай вобласці. Горад быў вызвалены ад паліцэйскіх і нямецкай жандармерыі 7 лістапада ўкраінскімі рэйдзіруючымі партызанскімі злучэннямі сумесна з байцамі лоеўскага партызанскага атрада «За Радзіму» пад камандаваннем Р. І. Сінякова. На пажарнай каланчы быў узняты чырвоны сцяг. На другі дзень, 8 лістапада, на цэнтральной плошчы г. Лоева адбыўся мітынг, які завяршыўся партызанскім парадам у гонар 25-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі [25, с. 56]. Парад прымалі камандзіры партызанскіх злучэнняў С. А. Каўпак и А. М. Сабураў. Вось як аб гэтай падзеі ўспамінаў пазней яго ўдзельнік, былы камандзір палка злучэння Каўпака П. Я. Брайко: «За ноч была збудавана і ўсталявана на цэнтральнай плошчы ў Лоеве трыбуна. Разведчыкі прыцягнулі сюды магутны трафейны радыёпрымач "телефункен", наладзілі яго на маскоўскую хвалю. Роўна ў 10.00 камандуючы парадам лейтэнант Гаркун далажыў аб гатоўнасці батальёнаў да параду. Пад гукі маскоўскага зводнага аркестра і трафейных акардэонаў міма трыбуны, на якой стаялі Ковпак, Руднеў, Сабураў, чаканячы крок, праходзілі партызанскія роты. Мінуючы трыбуну, яны паварочвалі направа, абыходзячы плошчу бакавымі вулачкамі, станавіліся ў хвост калоны і зноў працягвалі шэсце. Уся плошча была запоўненая народам. Людзі радаваліся, многія плакалі ад радасці. Так партызанскія роты маршыравалі гадзіны дзве ці тры. Магчыма, парад працягваўся б і даўжэй, калі б немцы не кінулі супраць партызан батальён эсэсаўцаў з бронемашынамі з Рэчыцы» [34].

Былы сакратар Гомельскага падпольнага абкама ЛКСМБ Аркадзь Дзянісавіч Рудак у кнізе сваіх успамінаў наступным чынам расказвае аб вызваленні дзякуючы рэйдзіруючым украінскім партызанскім злучэнням г. Лоева: «26 кастрычніка 1942 г. абодва ўкраінскіх злучэнні пад камандаваннем С. А. Ковпака і А. М. Сабурава па двух маршрутах паралельнымі калонамі, змятаючы на сваім шляху варожыя гарнізоны, рушылі на поўдзень. Пераходы здзяйсняліся настолькі імклівa, а ўдары былі такія вокамгненныя, што акупанты не маглі аказаць колькі-небудзь сур'ёзнага супраціву. У пачатку лістапада 1942 г. абодва злучэнні падышлі да Дняпра ў раёне Лоева. Раптоўнай пераправай на лодках праз раку і ударам перадавой групы аўтаматчыкаў варожы гарнізон Лоева быў знішчаны. Насельніцтва радасна сустрэла украінцаў. Беларусы дапамаглі арганізаваць на пароме і лодках пераправу на правы бераг асабістага склада, абозаў. Іх шлях пралягаў па беларускай зямлі, дзе гітлераўскія гарнізоны размяшчаліся пераважна ў буйных гарадах і на чыгуначных станцыях.

У Лоеве коаўпакаўцы знішчылі прадпрыемствы, якія працавалі на акупантаў, друкарню, лесазавод, электрастанцыю, млын, вузел сувязі. З захопленых харчовых складоў хлеб, соль і іншыя прадукты раздалі насельніцтву [35, с. 112–113].

Урачыста адзначалася партызанами таксама святкаванне 1 мая. У якасці прыкладу прыведзем паведамленне камандавання кавалерыйскага партызанскага атрада сакратару Баранавіцкага падпольнага абкама КП(б)Б В. Е. Чарнышову аб святкавання 1 траўня 1943 г., ад 2 траўня 1943 года. Дакумент падпісалі камандзір атрада Дзенісенка і начальнік штаба Фанышаў: «Пачатак урачыстага свята 1 мая а 10 гадзіне раніцы ў раёне Грабскага лесу. Пастраенне атрадаў было на пляцоўцы хутара Светуха – сумесна з жукоўскай брыгадай, дзе і быў праведзены ўрачысты мітынг. Пасля мітынгу быў парад.

Пасля чаго атрад (выстраіўся) у баявым парадку руху: галаўны дазор (разведвзвод), група коннікаў і матацыкла, 2-й ўзвод з Чырвоным сцягам атрада, 3-ці ўзвод з Чырвоным пераходзячым сцягам, гармата (СТГ) і 2 мінамёта, 1-й ўзвод, санітарная часць, кухня, абоз і тылавы дазор (з разведвзвода).

У такім парадку атрад рухаўся па маршруце: Новае Сяло, Погорэлкалка, Ярэмічы, Обрынь, Даўгінава, маёнток Кашчыца (адкуль было паслана «віншаванне» турэцкай паліцыі шляхам абстрэлу з гарматы пяццю снарадамі, а з батальённага мінамёта двума мінамі). Вынік (абстрэлу) – снарады падалі са-праўды ў цэль, адзін паліцэйскі забіты і два параненыя. З боку паліцыі пасле-даваў адказ – тры стрэлу з мінамёта, якія разарваліся далёка ад атрада ў роз-ных месцах. Далей атрад рухаўся праз в. Лядкі, Вялікая Слабада. Раптам раз-ведка данесла, што ў (в.) Палужжа ёсць разведка карнага атрада немцаў і паліцыі з Карэлічаў. Атрад працягваў рухацца па вызначаным маршруце ў (в.) Беразавец, адкуль добра было відаць немцаў і паліцыю. Немцы далі ў наш бок тры мінамётных стрэлы і адышлі, не прыняўшы бою, нягледзячы на тое, што наша месца было нявыгаднае для бою. Далей атрад рухаўся (па маршруце): Велетова, Тарасавіч, Вялікая Слабада, дзе і размясціўся на нач-лег. На начлезе, а таксама па шляху руху па вёсках атрад спыняўся. Народ сустракаў (партызан) з гарачым пачуццём. Пад гукі атраднай музыкі моладзь вёсак спявала і танчыла з нашымі партызанамі. Пасля начлегу 2 мая ў 13.00 атрад вярнуўся праз (в.) Новае Сяло ў лагер у поўным складзе. На парадзе ўручаны Чырвоны пераходзячы сцяг 2-му ўзводу за паспяховае выкананне загаду камандзіра атрада за № 338 ад 25 красавіка 1943 г. аб пераходзе з пяхоты кавалерыі)» [35, арк. 14–15].

А вось як апісвае святкаванне 1 мая 1943 года партызанамі 1-й Мінскай партызанскай брыгады (камандзір – Мікалай Харлампіевіч Балан) былы начальнік штаба брыгады Міхаіл Міхайлавіч Джагараў: «У гэтую бясхмарную раніцу партызанскія падраздзяленні, свабодныя ад нясення разведвальнай, дыверсійнай, ахоўнай і гаспадарчых службаў, рыхтаваліся да ўрачыстай сустрэчы свята Першага мая. Густыя шарэнгі партызан з баявымі і святочнымі сцягамі, невялікімі транспарантамі і заклікамі (лозунгамі), з партрэтамі савецкіх правадыроў і палкаводцаў рушылі ў цэнтр сваёй зоны да вёсак Чырвоны Бераг, Угалец і Міжрэчча. На ўскраінах пасёлкаў і вёсак іх ужо чакалі мясцовыя жыхары – састарэлыя бацькі і маці, малодшыя браты і сёстры. Як заўсёды, дзетвара была наперадзе. **Амаль на ўсіх дамах і браме вывешаны чырвоныя сцягі. Аблічча вёсак і іх жыхароў былі святочным.** На вясковых могілках,

у брацкіх магіл ляжалі жывыя кветкі. Да калоны партызан спяшаліся жанчыны і дзеці. Многія з жыхароў знаходзілі сярод тых, хто прыбыў на ўрачыста-святочныя мерапрыемствы, сваіх бацькоў, мужоў, сыноў і дачок-партызан ...Пастроіўшыся ўздоўж старой алеі з ліп і акацый зводныя партызанскія роты чакалі пачатку ўрачыстасцяў. На ўсходняй ускраіне вёскі Красны Бераг, на вялікай паляне, якая прымыкае да лесу, адбыўся ўрачысты мітынг. Адкрыў яго сакратар Чэрвеньскага падпольнага райкама партыі Кузьма Кузьміч Краўчанка ...Пасля ўрачыстага мітынгу пачаўся партызанскі парад. У шэрагах народных мсціўцаў рука аб руку ішлі кадравы ваенны і партыйны работнік, інжынер і калгаснік, працоўны і лекар, людзі розных узростаў і нацыянальнасцяў, але ўсіх іх аб'ядноўваў высокі патрыятызм і адно жаданне – хутчэй вызваліць сваю зямлю ад фашысцкіх акупантаў. Характэрным было тое, што парад праходзіў у шасцідзесяці кіламетрах ад праходу гітлераўцамі ад Мінска і ўсяго ў дзесяці-пятнаццаці кіламетраў ад буйных варожых гарнізонаў». Пасля параду адбыўся партызанскі канцэрт, падрыхтаваны былымі выкладчыкамі і студэнтамі Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі С. Маркоўскім, А. Каландзёнкам, М. Варонiным і Г. Шуняковым [36, с. 227–228].

Масава-палітычная праца сярод партызан, насельніцтва партызанскіх зон актыўна праводзілася партызанскімі агітатарамі на працягу ўсяго перыяду акупацыі. Асабліва яна актывізавалася з лета 1943 года, калі стала вядома аб перамозе Чырвонай арміі на Курскай дузе і яе пераходзе ў наступленне.

З выключным уздымам праводзіліся сходы, мітынгі партызан і насельніцтва на тэрыторыі Мінскай вобласці. Так, уздзенскі падпольны райкам партыі правёў у 1943 годзе ў 84 вёсках 185 мітынгаў і больш за 300 дакладаў і гутарак. Капыльскім падпольным райкамам былі ахоплены палітычнай працай 15 сельсаветаў з 16. У 182 населеных пунктах раёна штомесячна праводзілася каля 300 сялянскіх сходаў. Старадарожскі райкам выдзяліў з ліку камуністаў і камсамольцаў 110 агітатараў, якія за шэсць месяцаў правялі ў 55 вёсках больш за 500 гутарак і каля 20 сходаў [37, с. 35–36]. Актыўная масава-прапагандысцкая праца праводзілася Слуцкім і іншымі райкамамі вобласці. Гэта датычыцца дзейнасці падпольных органаў і партызанскіх фарміраванняў Віцебскай, Магілеўскай, Палескай, а таксама заходніх абласцей Беларусі. Дзякуючы сістэматычнай інфармацыі, якая распаўсюджвалася таксама з дапамогай падпольнага друку (газет, лістовак, плакатаў), а таксама арганізацыі праслухоўвання радыёперадач з Масквы байцы падпольнага фронту і насельніцтва былі ў курсе падзей, якія адбываліся на фронце, а таксама ведалі аб дзейнасці саюзнікаў СССР па антыгітлераўскай кааліцыі.

У якасна новых умовах, якія характарызаваліся бліскучымі перамогамі Чырвонай арміі летам-восенню 1943 года, адбывалася падрыхтоўка да святкавання 26-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Чырвоная армія прыступіла да вызвалення ўсходніх раёнаў Беларусі, таму чаканне хуткай сустрэчы і поўнага вызвалення тэрыторыі рэспублікі авалодвала настроем партызан і насельніцтва. Перад партызанамі ўсталі задачы непасрэднага баявога ўзаемадзеяння з надыходзячымі воінскімі часткамі Беларусі [38, арк. 20].

«Напярэдадні свята Жлобінскі райкам партыі, камандаванне атрадаў накіравалі ў населеныя пункты партызанскіх агітатараў для правядзення гутарак пра гэтую дату і поспехах Чырвонай арміі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, – узгадвае былы член Жлобінскага межрайкома партыі Клаўдзія Ксенафонтаўна Карпенка, – напярэдадні мы прынялі па радыё паведамленне аб вызваленні Кіева. Радасці нашай не было мяжы – набліжаецца гадзіна поўнага вызвалення і беларускай зямлі. 7 лістапада 1943 г. прайшлі агульныя сходы партызан, на якіх з дакладамі выступілі члены райкама партыі, камісары, палітрукі рот. У 116-м атрадзе* адбыўся парад народных мсціўцаў» [39].

Сакратар Баранавіцкага падпольнага гаркама КП(б)Б Елізавета Васільеўна Папова ўспамінае, што яна вельмі ўзрадавалася калі 17 кастрычніка 1943 г. выйшаў першы нумар газеты «За Радзіму» – органа Баранавіцкага падпольнага гаркама партыіі. Адначасова пачалі выпускаць і лістоўкі. Адну з іх прысвяцілі 26-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. У ёй былі прыведзены вынікі баёў Чырвонай Арміі за апошнія 4 месяцы. «Раніцай 7 лістапада атрад імя Ф. Э. Дзяржынскага быў пастроены на паляне. Было холадна, выпаў снег. Аднак ніхто на гэта не звяртаў увагі. Камандзір атрада павіншаваў са святам, аб'явіў падзяку лепшым з лепшых. Затым выступіла я. Паведаміла, што напярэдадні ў Маскве на ўрачыстым сходзе выступіў І. В. Сталін, коратка выклала яго змест, пасколькі змагла запісаць па рацыі. Вытрымкі з гэтага даклада надрукавалі потым у газеце» [40, с. 139].

Мы ўжо адзначалі раней, што мітынгі і сходы праводзіліся партызанскім камандаваннем падчас выканання рэйдаў у іншыя вобласці. Так, падчас рэйда ў Брэсцкую вобласць партызанскай брыгады «За Радзіму» імя А. К. Флегантава яна спынілася ў в. Нежын Любанскага раёна, дзе і адбылося святкаванне 26-й гадавіны Кастрычніка. Партызаны падрыхтавалі для вяскоўцаў канцэрт мастацкай самадзейнасці. *7 лістапада,* – успамінае камандзір брыгады І. В. Жохаў, *– вясковы клуб быў перапоўнены. Абстаноўка – святочная. На сценах – лозунгі. На сцэну выйшлі тры гарманіста, расцянулі мяхі і загучэла мелодзія «Інтэрнацыянала». Я выступіў з дакладам. Вялізную цікавасць выклікала паведамленне аб тым, што 6 лістапада войскі 1-га Украінскага фронта вызвалілі Кіеў. Пасля ўрачыстай часці пачаўся канцэрт* [41, с. 342].

Такая я ж абстаноўка панавала практычна ва ўсіх партызанскіх зонах, за выключэннем раёнаў, дзе ў гэты час праводзіліся карныя экспедыцыі ворага. Асабліва гэта тычыцца цэнтральных і заходніх рэгіёнаў Беларусі. Тут актыўную працу разгарнулі падпольныя партыйныя і камсамольскія органы і арганізацыі. *Аб нашым уплыве на масы сведчыць, напрыклад, той факт, што 7 лістапада 1943 г. у большасці вёсак раёна,* – успамінаў пазней былы першы сакратар Лепельскага падпольнага РК КП(б)Б У. Е. Лабанок, *– былі праведзены ўрачыстыя вечары, прысвечаныя 26-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, масавыя гулянні моладзі. Шырока адзначалі гэтае свята і ў партызанскіх падраздзяленнях* [42].

---

*116-й партызанкі атрад (камандзір – І. Я. Пабаловец.) створаны ў верасні 1943 г. з партызан 6-й роты атрада «Жэлязняк». На дзень расфарміравання 26.11.43 налічваў 314 партызан.

У гэты ж дзень у многіх партызанскіх фарміраваннях, якія дзейнічалі на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі, таксама праходзілі сходы, мітынгі, а таксама партызанскія парады. Так, 7 лістапада 1943 г. у Паўднёвай зоне Налібоцкай пушчы адбыўся мітынг і партызанскі парад, у якім прымалі ўдзел шэраг партызанскіх атрадаў, у тым ліку кавалерыйскі атрад пад камандаваннем Д. А. Дзенісенка. Былы камісар атрада маёр Уладзімір Аляксеевіч Грэчанічэнка ўспамінаў пазней, што адразу пасля парада атрад накіраваўся на баявую аперацыю па разгрому паліцэйскага гарнізона ў в. Нягневічы Карэліцкага раёна [42, с. 13].

*У гонар 26-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі камсамольска-дыверсійна-падрыўная група дзяўчат пры камендацкім узводзе (старшая групы – камсамолка Адзінец Вера, падрыўнікі – камсамолкі Осіна Паліна, Гарбунова Аляксандра, Губінская Ніна, Войніч Станіслава) у ноч з 7 на 8 лістапада 1943 года пусціла пад адхон варожы эшалон на ўчастку Гарадзея-Баранавічы. Пашкоджаны паравоз і 7 вагонаў. Рух прыпынены на 30 гадзін,* – паведаміў у Баранавіцкі падпольны абкам камсамола памочнік камісара па камсамолу партызанскай брыгады імя Г. К. Жукава Аляксей Васільевіч Новікаў [43, с. 130]. Адзначым, што кіраўнік групы Вера Іосіфаўна Адзінец прыбыла ў тыл ворага па накіраванню БШПР. Спачатку кіравала жаночай, а потым мужчынскай дыверсійна-падрыўной групай. Асабіста пусціла пад адхон тры варожых цягніка. У студзені 1944 г. была прызначана камісарам створанага на базе камендацкага ўзвода брыгады партызанскага атрада «25 год ВЛКСМ» (камандзір – А. В. Новікаў). Атрад злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 10 ліпеня 1944 г. у складзе 98 партызан [8, с. 69–70].

Як бачна са справаздачы Антопальскага РК КП(б)Б за перыяд працы з верасня 1943 па ліпень 1944 года, на тэрыторыі раёна ў савецкія святы «Дзень Чырванай арміі», 1 мая, а таксама ў 3-ю гадавіну пачатку вайны патрыёты ў гарнізонах праціўніка Антопаль, Гарадзец і Вулька вывешвалі заклікі, плакаты з рознымі карыкатурамі на гітлераўскае кіраўніцтва, на паражэнні гітлераўскай арміі, на паліцыю і мясцовую адміністрацыю... У цэнтры Антопаля і Гарадца чырвоныя сцягі былі вывешаны ў цэнтры горада. Цікава, што гэтыя заклікі (лозунгі) і плакаты мадзьярскія салдаты не дазвалялі зрываць паліцыі, пакуль не вывучалі іх самі, застаўлялі чытаць мясцовых сялян і перадаваць сэнс. Вывешаны на доме мясцовага бургамістра ў Гарадцы чырвоны сцяг яны не дазволілі паліцыі здымаць на працягу цэлага дня 1 мая 1944 года [44, арк. 89].

Падводзячы вынік, адзначым, што прыведзеныя прыклады сведчаць аб тым, што святкаванню савецкіх святаў, асабліва гадавін Кастрычніцкай рэвалюцыі, асноўнага савецкага свята, падпольнымі партыйнымі органамі, камандаваннем партызанскіх фарміраванняў Беларусі надавалася важнае значэнне. Дакументы таго часу сведчаць таксама, што акрамя асноўнага свята – Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі – у арганізацыйнай і масава-прапагандысцкай дзейнасці партызан і падполля шырока выкарыстоўваліся і адзначаліся насельніцтвам Беларусі і іншыя савецкія святы і рэвалюцыйныя даты: дні РККА, 1-га мая, гадавіны БССР, камсамола. У іх гонар называліся партызанскія фарміраванні,

праводзілася «сацыялістычнае спаборніцтва», падводзіліся і асвятляліся іх вынікі. Безумоўна, сам факт арганізацыі і святкавання рэвалюцыйных дат меў для насельніцтва і партызан вялікае значэнне, як у выхаванні патрыятычных пачуццяў, так і ўмацаванні веры ў хуткую перамогу над ворагам.

Можна канстатаваць, што захаванне насельніцтвам нацыянальных і новых савецкіх традыцый у галіне грамадскага жыцця і сямейна-бытавых адносін, адзначэнне савецкіх святаў, прытрымліванне іх рытуалаў з'яўляліся як сведчаннем палітычнай і ідэалагічнай дэманстрацыі лаяльнасці насельніцтва да савецкай улады, так і сведчаннем непрымання імі акупантаў і іх палітыкі, а па вялікаму рахунку, адным з важных накірункаў барацьбы беларукага народа з захопнікамі.

Мітынгі жыхароў гарадоў і вёсак Беларусі, прысвечаныя вызваленню ад нямецка-фашысцкай акупацыі, з'ялялісіся як праявай стыхійнага праяўлення пачуццяў насельніцтва ў адносінах да сваіх вызваліцеляў, так і загаддзя сплanаванай акцыяй кіраўніцтва рэспублікі, абласных і раённых органаў улады.

Безумоўна, гэтыя мерапрыемствы з'ялялісіся праявамі палітычнай і ідэалагічнай дэманстрацыі лаяльнасці насельніцтва да савецкай улады, удзячнасці Чырвонай Арміі за вызваленне.

Партызанскія парады з'яўляліся для кіраўніцтва рэспублікі пэўнай дэманстрацыяй сілы і моцы партызанскага руху перад Масквой, а таксама ўкладу беларускага народа, беларускіх партызан у перамогу ў аперацыі «Баграціён». Пры расфармаванні партызанскіх атрадаў і брыгад было адабрана і накіравана на партыйна-савецкую працу 53 тыс. партызан, з іх 2219 чалавек камандна-палітычнага складу накіраваны на кіруючыя пасады. Тысячы партызан былі накіраваны на працу ў органы НКУС-НКДБ.

## ЛІТАРАТУРА

1. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – Т. 4. Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938–1945 гг.). – 640 с.

2. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3-х / гл. редкол. : А. Т. Кузьмин [и др.]. – Минск : Беларусь, 1983–1985. – Т. 1–3.

3. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 / А. А. Коваленя (рук. авт. коллектива), А. М. Литвин, В. И. Кузьменко [и др.]. – Минск : БЕЛТА, 2005. – 544 с.

4. Вклад белорусского народа в Победу в Великой Отечественной войне / А. М. Литвин [и др.]; редкол. : А. А. Коваленя (гл. ред.)[и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2015. – 495 с.

5. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) : док. и материалы : в 3 т. – Т. 1. Зарождение и развитие партизанского движения в первый период войны (июнь 1941 – ноябрь 1942). – Минск : Беларусь, 1967. – 744 с. ; Т. 2. Развитие

всенародного партизанского движения во второй период войны. Кн. 1 (июль – декабрь 1943 г.). – Минск : Беларусь, 1978. – 680 с. Т. 2. Развитие всенародного партизанского движения во второй период войны. Кн. 2 (июль – декабрь 1943 г.). – Минск : Беларусь, 1978. – 814 с. Т. 3. Всенародное партизанское движение в Белоруссии на завершающем этапе (январь – июль 1944). – Минск : Беларусь, 1982. – 792 с.

6. Комсомол Белоруссии в Великой Отечественной войне : док. и материалы / Ин-т истории партии при ЦК КПБ ; сост. Г. Н. Шевела – Минск: Беларусь, 1988. – 495 с.

7. Партизаны в операции «Багратион» : док. и материалы / Департамент по архивам и делопроизводству, Мин-во юстиции Республики Беларусь, НАРБ сост. : Н. А. Денисова [и др.] ; ред. кол., В. И. Адамушко [и др.]. – Нац. библиотека Беларуси, 2014. – 412 с.

8. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) : крат. сведения об организац. структуре парт. соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе. – Минск : Беларусь, 1983. – 765 с.

9. *Гужалоўскі, А.* «Няхай жыве наш родны Сталін» : масавыя святы ў БССР у 1929–1953 гг. // Беларус. гіст. час. – 2019. – № 2. – С. 3.

10. Советские массовые праздники / М. Рольф ; пер. с нем. В. Т. Алтухова. – М. : Рос. политическая энцикл. (РОССПЭН) : Фонд Первого Президента России Б. Н. Ельцина, 2009. – 439 с.

11. *Мачульский, Р.* Вечный огонь / Р. Мачульский. – 3-е изд. – Минск, 1978. – С. 133.

12. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 155а.

13. *Несцярэнка, У.* Па закліку сэрца / У. Нясцярэнка // Дзвінская праўда. – 1982. – 13 сакавіка.

14. *Лысенок, Г. К.* Сильные духом / Г. К. Лысенок // Люди нарочанского края : Воспоминания участников революц. борьбы и Велик. Отечеств. войны. – Минск : Беларусь, 1975. – 592 с.

15. *Кожар, И. П.* Незабываемые дни партизанской борьбы на Гомельщине / И. П. Кожар, Е. И. Барыкин // Партийное подполье в Белоруссии, 1941–1944 : Страницы воспоминаний. Витеб., Могилев., Гомел., Полес. обл. / Ин-т марксизма-ленинизма при ЦК КПСС ; сост. С. К. Грабовский, Н. Е. Достенко, А. И. Залесский [и др.]. – Минск : Беларусь, 1985. – 415 с.

16. *Куцак, А. А.* Годы трудных испытаний / В грозные годы : Воспоминания участников борьбы против нем.-фашист. оккупантов на территории Гомел. и Полес. обл. – Минск : Беларусь, 1973. – 397 с.

17. *Ветров, И. Д.* Народная война в белорусском Полесье / И. Д. Ветров, Н. И. Малинин // Непокоренная Белоруссия. – М., 1963.

18. *Капустенок, Г. В.* С верой в победу / Г. В. Капустенок. – Минск, 1980.

19. *Долготович, Б. Д.* От парада надежды – к параду Победы / Б. Д. Долготович ; под ред полк. В. М. Пастухова. – Минск : Технопринт, 2005.

20. *Сталін, І. В.* Аб Вялікай Айчыннай вайне Савецкага Саюза / І. В. Сталін. – Выд. ЦК КП(б)Б «Совецкая Беларусь», 1943.

21. *Ливенцев, В. И.* Партизанский край : Боевой путь 1–й Бобруйск. партиз. бригады в Велик. Отечеств. войне. – 4-е изд. – Минск : Беларусь, 1988. – 319 с.

22. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. / гл. редкол. : А. Т. Кузьмин [и др.]. – Минск : Беларусь, 1983. – Т. 1. – 591 с.

23. *Ильинковский, М. К.* Шла война народная / М. К. Ильинковский. – Минск, 1973.

24. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) : док. и материалы : в 3 т. – Минск : Беларусь, 1967. – Т. 1. Зарождение и развитие партизанского движения в первый период войны (июнь 1941 – ноябрь 1942). – 744 с.

25. Из истории партизанского движения в Белоруссии. 1941–1944. Минск, 1961.

26. Зборнік лістовак усенароднай партызанскай барацьбы ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. – Мінск, 1952.

27. *Липило, П. П.* КПБ – организатор и руководитель партизанского движения в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны / П. П. Липило. – Мінск : Беларусь. – С. 87–88.

28. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 490.

29. *Калинин, П. З.* Партизанская республика / П. З. Калинин. – 3-е изд. – Минск : Беларусь, 1973. – 367 с.

30. Памяць : гіст.-дакум. хроніка Ушацкага раёна. – Мінск, 2003.– 638 с.

31. *Рубис, П. Е.* Флаги над сельсоветами / П. Е. Рубис // Партийное подполье в Белоруссии, 1941–1944 : Страницы воспоминаний Витеб., Могилёв., Гомел., Полес. обл. – Минск : Беларусь, 1985.

32. *Клещев, А. Е.* Партизаны и население Пинской области в борьбе с фашистскими захватчиками / А. Е. Клещев // Партийное подполье в Белоруссии, 1941–1944 : Страницы воспоминаний Вилей., Баранов., Пин., Брест., Белосток. обл. – Минск : Беларусь, 1986.

33. Пціцкая аперацыя 1942 / Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыкл. / рэдкал. : І. П. Шамякін (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск : Гал. рэд. БелСЭ, 1990. – 680 с.

34. *Анисовец, В.* Парад принимал Ковпак / В. Анисовец // Серп и молот. – 2007. – 6 ноября.

35. НАРБ. Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 263.

36. *Джагаров, М.* Костры партизанские. – 2-е изд., перер. и доп. – Минск : «Беларусь», 1974. – 336 с.

37. *Козлов, В. И.* Коммунисты – оганизаторы партизанской борьбы в Минской области / В. И. Козлов // Непокоренная Белоруссия. – М., 1963.

38. НАРБ. Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 233.

39. Успаміны К. К. Карпенка. Рукапіс (архіў аўтара).

40. *Попова, Е. В.* Наша опора / Е. В. Попова // Партийное подполье в Белоруссии, 1941–1944 : Страницы воспоминаний. Вилей., Баранович., Пин., Брест., Белосток. обл. – Минск : Беларусь, 1986.

41. *Жохов, И. В.* Боевые будни / И. В. Жохов // Партийное подполье в Белоруссии, 1941–1944 : Страницы воспоминаний. Вилей., Баранович., Пин., Брест., Белосток. обл. – Минск : Белась, 1986.

42. *Лобанок, В. Е.* Партизаны принимают бой / В. Е. Лбанок. – М., 1972.

43. *Гречаниченко, В. А.* В годы суровых испытаний. Воспоминания / А. А. Гречаниченко. – 15.04.1986 г. – С. 13 (архив автора).

44. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 481.